**УДК 908(476)**

# САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНАЕ І КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ МЯСТЭЧКА КРАСНАЕ МАЛАДЗЕЧАНСКАГА ПАВЕТА Ў 20–30-я гады XX ст.

***Д.В. ПАЛЫНСКАЯ***
***(Прадстаўлена: канд. біял. навук, доц. В.А ЕМЯЛЬЯНЧЫК)***

*Зроблена агульная характарыстыка сацыяльна-эканамічнага і культурнага аспектаў развіцця мястэчка Краснае ў складзе Польшчы. Новае адміністрацыйнае становішча спрыяла развіццю камунікацый і мадэрнізацыі – з’яўляецца тэлефон, электрычнасць, каналізацыя. Развіваецца дробны бізнес у выглядзе прыватных крам і забаўляльных устаноў. Ідэяй паланізацыі прасякнуты адукацыя і выхаванне. Культурнае жыццё становіцца больш разнастайным дзякуючы дзейнасці моладзевых арганізацый, з’яўленню тэатра і кіно.*

У міжваенны перыяд на тэрыторыі Заходняй Беларусі аднаўляюцца мястэчкі — пераходны тып паселішча між горадам і вёскай. Мястэчкі выконвалі не толькі адміністрацыйныя, але і культурныя функцыі ў гміне ці павеце, цэнтрамі якіх з’яўляліся. Палітыка паланізацыі, накіраваная на стварэнне этнічнааднародных паселішчаў, не магла не адбіцца на развіцці культурнага жыцця, адукацыі і побыту.

Пасля падпісання ў 1921 г. Рыжскай мірнай дамовы далучаныя да ІІ Рэчы Паспалітай землі Заходняй Беларусі былі падзелены на 4 ваяводствы: Віленскае, Палескае, Беластоцкае і Навагародскае. Мястэчка Краснае належала спачатку да Вілейскага, а пасля Маладзечанскага павета, які ўваходзіў у склад Віленскага ваяводства. Краснае з’яўлялася адміністрацыйным цэнтрам гміны, якая ўключала 18 сельскіх грамад (113 населеных пунктаў). Паводле перапісу за 1921 г., у самім мястэчку пражывала 1012 жыхароў (477 мужчын, 535 жанчын). Паводле нацыянальнасці, у перапісе зафіксавана 190 палякаў, 513 беларусаў, 2 немцы, 303 яўрэя [1, с. 86].

Новае адміністрацыйнае становішча – у якасці цэнтра гміны – паспрыяла з’яўленню тэлеграфа і тэлефоннай сувязі. З’яўляюцца гмінная ўправа і паліцэйскі пастарунак, прыватныя канторы – адвакацкая і натарыяльная. Гмінным праўленнем рабіліся спробы наладжвання эканамічнага і сацыяльнага дабрабыту – частка сродкаў з бюджэту ішла на будаўнічыя работы (рамонт, брукоўка дарог, будаўніцтва школ, бальніц, жылля для вайскоўцаў) [2, с. 150]. Вуліцы мястэчка атрымалі новыя назвы: Ю. Пілсудскага, І. Масціцкага, 3 Мая, плошча 6 Жніўня. У 1927 г. ў мястэчку з’яўляецца першае электрычнае асвятленне – яго праводзілі ў афіцэрскія дамы ў кашарах і на чыгунку, да дзяржаўных устаноў.

У 20-30-я гады развіваецца стацыянарная медыцына, удасканальваецца яе матэрыяльная база дзякуючы з’яўленню электрычнага святла, каналізацыі, вентыляцыйных устаноў, тэлефона і г.д. Разам з тым захоўваюцца праблемы, звязаныя з высокімі коштамі лячэння, недастатковай колькасцю медустаноў і адсутнасцю кваліфікаваных кадраў. У той жа час Краснае з’яўлялася цэнтрам аднаго з пяці ўрачэбных раёнаў Маладзечанскага павета [3, с. 142]. У мястэчку знаходзілася бальніца.

Пераважная частка насельніцтва займалася сельскай гаспадаркай. У краснасельскай воласці надзеленая і набытая зямля размяркоўваліся наступным чынам: менш адной дзесяціны валодалі 3 гаспадаркі, ад 1 да 2 дзесяцін – 22 гаспадаркі, ад 2 да 3 – 59 гаспадарак, звыш 3 дзесяцін – 972 гаспадарак [2, с. 269]. Ускладняла становішча сельскай гаспадаркі падатковая сістэма. Сярод непасрэдных падаткаў, якія даводзілася плаціць насельніцтву, былі зямельны, камунальны, дарожны, інвестыцыйны, крызісны, надзвычайны, шаркаварны, страховачны, гмінны і інш.

Праз мястэчка праходзіў шлях Вільня-Маладзечна-Мінск. Важную ролю грала чыгунка – пуці былі звужаныя да еўрапейскіх памераў, двойчы на дзень праходзіў цягнік з Вільні да Аляхновіч. Гэта станоўча ўплывала на развіццё гандлю – у 30-я гады налічвалася больш за тры дзясяткі крамаў. Іх можна падзяліць па характару продажу тавараў: харчовыя, спіртныя, тытунёвыя і рознага тавару. Перад кожнай крамай знаходзіўся прыўзняты ганак, над якім вывешвалася шыльда. Ёсць звесткі пра гасцініцу, пякарні, аптэкі, цырульні, швейныя і абутковыя майстэрні, казіно, рэстаран, чайную, фотаатэлье [2, с. 290].

Свабода прадпрымальніцкай дзейнасці і адсутнасць забаронаў з боку дзяржавы мела і некаторыя негатыўныя наступствы. Так, па інфармацыі мясцовага жыхара і краязнаўцы Аляксандра Харытона, у мястэчку працавала парадку 6 публічных дамоў, найбольш папулярны з якіх знаходзіўся каля чыгуначнага вакзалу і меў назву «Златы пясэк» [4]. Разнастайнасць публічных і забаўляльных устаноў можна патлумачыць тым, што каля Краснага дыслацыраваліся адно з падраздзяленняў 10-тага батальёну

Корпуса Аховы Памежжа і 8-ы эскадрон, аб'яднаныя назвай «Krasne». Дзяржаўная мяжа з СССР праходзіла менш чым за 20 км, і пагранічнікі сачылі за парадкам на даверанай тэрыторыі. Склад жаўнераў і афіцэраў часта абнаўляўся – служба ішла цягам двух год. Вышэйшыя чыны прывозілі з сабой сем'і.

Згодна з дадзенымі перапісу 1921 года, паводле канфесійнага складу сярод жыхароў было зарэгістравана 152 каталіка, 539 праваслаўных, 2 пратэстанты і 319 прадстаўнікоў іўдзейскай веры [1, с. 87]. Адпаведна, мястэчка было шматмоўным – маглі гучаць польская, беларуская, руская мовы. На працягу ўсяго міжваеннага перыяду ў мястэчку была адкрыта і дзейнічала праваслаўная Свята-Пакроўская царква і каталіцкі касцёл Унебаўзяцця Найсвяцейшай Панны Марыі [6, с. 175]. У касцёле дзякуючы ахвяраванням афіцэраў і ніжэйшых чыноў мясцовага гарнізону ў гэты перыяд з'явіліся бакавыя алтары з абразамі святога Казіміра і святога Антонія.

Немалая ўвага надавалася развіццю адукацыі і выхавання. У Красненскай гміне была створана школьная камісія, якая адказвала за арганізацыю навучальнага працэсу. У мястэчку школа існавала з 1875 года. У час Першай сусветнай вайны яна не працавала, але па просьбе жыхароў была адноўлена. За акрэслены перыяд пабудаваны новы навучальны будынак, а таксама стадыён, паветка для сталярных работ. Быў закладзены школьны сад і разбіты агарод. У школе дзеці вучыліся 7 год. Навучанне праходзіла па-польску, за выключэннем заняткаў па рэлігіі, якія спачатку праводзіў праваслаўны святар на царкоўнаславянскай мове [2, с. 224]. У 1927 г., згодна з распараджэннем Міністэрства веравызнання і адукацыі, заняткі па каталіцкай рэлігіі павінны былі абавязкова праводзіцца ва ўсіх навучальных установах. Адзначаецца, што ў выпадку, калі ў школе было хаця б 12 вучняў каталіцкага веравызнання, дырэкцыя мусіла прызначыць выкладчыка гэтай дысцыпліны [5, с. 3].

Для выхавання моладзі ў рэчышчы паланізацыі ствараліся адпаведныя грамадскія арганізацыі. Афіцыйнымі мэтамі іх з'яўляліся: аб'яднанне моладзі ў згуртаванае і дысцыплінаванае грамадства, выпрацоўка салідарнасці і сяброўства, стварэнне здаровых калектыўных поглядаў і павышэнне этычнага ўзроўню, развіццё ініцыятывы і творчых здольнасцей навучэнцаў і г.д. Для школьнікаў малодшага ўзросту паўсюдна арганізоўваліся гарцэрскія дружыны. Гарцэры мелі форму з гальштукамі, дружыны хадзілі ў паходы, займаліся спортам, развучвалі песні, удзельнічалі ў маршах на дзяржаўныя святы [7, с. 86]. Для моладзі старэйшага ўзросту ў 1927 г. была створана ваенізаваная арганізацыя «Саюз стралецкі».

Цэнтрам аб'яднання моладзі і адначасова своеасаблівай культурнай пляцоўкай быў Дом Людовы. Тут праходзілі заняткі, гульні ў шашкі і шахматы, спартовыя спаборніцтвы. Можна было паглядзець прывазное нямое кіно. Агулам колькасць кінематаграфічных установак па ваяводству у перыяд з 1923 па 1932 гг. павялічылася з 39 да 70 [6, с. 184]. Музычнае суправаджэнне ствараў музыкант на сцэне за піяніна. Білет каштаваў 20 грошаў (цана дзясятка яек), ваенныя праходзілі бясплатна. На сцэне артысты з ваеннаслужачых перыядычна наладжвалі скетчы і невялікія выступы. Уваход на іх быў вольны [2, с. 293].

Тэатр, з пункту гледжання дзяржаўнай палітыкі, быў важным сродкам паланізацыі і распаўсюджвання польскай культуры. Паводле статыстыкі, ва ўсходніх ваяводствах было 10 тэатраў, з іх – 6 сталых і 4 вандроўных [6, с. 184]. Штогадовы квартальнік «Front teatralny» прыгадвае, што ў гастрольны тур Віленскага вандроўнага тэатра было ўключана і Краснае [8, с. 27]. Школьнікі і ўдзельнікі моладзевых арганізацый таксама ладзілі свае пастаноўкі. Найбольш удалыя спектаклі паказвалі пасля на сцэне Дома Людовага і ў кашарах.

Пытанням местачковай асветы і тэатральнай дзейнасці былі прысвечаны матэрыялы ў рэгіянальных газетах «Kurier Wilenski», «Ziemia Wilenska» і неафіцыйных «Słowo», «Беларуская крыніца», «Шлях моладзі». Як важная падзея прадстаўляецца ўрачыстае ўручэнне ў мястэчку 100-гадоваму удзельніку паўстання 1863 г. Ігнацыю Абрамовічу ганаровых ветэранскіх адзнак, а менавіта шапкі ветэранскай разам з паўстанцкім крыжом ад Таварыства Сяброў Ветэранаў [2, с. 374]. Невялікімі нататкамі ў хроніках прыгадваюцца надзвычайныя здарэнні з Краснага – страты дакументаў, крадзяжы, забойствы. Напрыклад, паведамленне пра падпал Броўкам Томашам чатырох стагоў сена, агульны кошт якіх быў ацэнены ў 900 злотых [9, с. 3].

Каб атрымаць звесткі пра жыццё ў Савецкай Беларусі і іншых краінах, жыхары Краснага майстравалі прасцейшыя радыёпрыёмнікі і праз навушнікі маглі пачуць Мінск ці Вільню. Слухаць радыё местачкоўцы збіраліся ў некалькі чалавек і абмяркоўвалі навіны [4]. Па аўторках на плошчу мястэчка збіраліся жыхары з бліжэйшых вёсак для набыцця ці продажу сельскагаспадарчых тавараў. Раз на год прыязджаў цырк, шацёр размяшчаўся на рынкавай плошчы. Для моладзі былі ўстроеныя арэлі, якія працавалі толькі ў нядзелю і святочныя дні. Пакатацца можна было за плату, але тут заўсёды збіралася моладзь, спявала песні, танцавала. Па суботах на Рынкавай плошчы ладзіліся танцы, на якіх іграў ваенны аркестр [2, с. 294]. Па дзяржаўных святах праходзілі парады вайскоўцаў з удзелам гарцэскіх дружын.

Такім чынам, сацыяльна-эканамічнае і культурнае становішча мястэчка ў міжваенны перыяд змяняецца. Новая адміністратыўная роля мястэчка ў якасці гміны абумовіла пэўную мадэрнізацыю – з'явіўся тэлефон, электрычнасць, адпаведна, паляпшаецца камунікацыя і сувязь. Наладжваюцца спробы вырашэння медыцынскага і санітарнага пытання. Развіваецца дробны гандаль і прыватныя прадпрыемствы, якія трымала яўрэйскае насельніцтва. У межах адукацыйнага працэсу паглыбляецца працэс паланізацыі і выхавання прывабнай дзяржаве моладзі. З'яўляюцца новыя формы баўлення часу – кіно, тэатр, забаўляльныя мерапрыемствы, казіно і г.д. Нягледзячы на значнае выдзяленне каталіцкай рэлігіі, у мястэчку не ўзнікае канфлікту – праваслаўная царква працягвала сваю дзейнасць. Разам з тым, польская мова ўкараняецца ў школе, касцёле, газетах і часопісах. Суіснаванне польскай, як дамінуючай, і іншых нацыянальных культур стала галоўным фактарам трансфармацыі культурных працэсаў.

ЛІТАРАТУРА

1. Skorowidz miejscowości Rzeczypospolitej Polskiej. T. VII. Część II. Ziemia Wileńska. Powiaty: Brasław, Duniłowicze, Brasław i Wilejka [Электронны рэсурс] / PDL. – Рэжым доступа: http://pbc.biaman.pl/dlibra/docmetadata?id=3086. – Дата доступа: 25.09.2016.
2. Старыкевіч, С.В. Красненскія таямніцы / С.В. Старыкевіч. – Маладзечна : Тип. «Победа», 2012. — 616 с.
3. Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Маладзечна і Маладзечанскага раёна / рэд. кал.: Г.П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 2002. — 792 с.
4. Krasnoje. Był tam jeden kościół, sześć domów publicznych i dwa obozy jenieckie [Электронны рэсурс] / Wschodnia Gazeta Codzienna. – Рэжым доступа: http://kresy24.pl/krasnoje-byl-tam-jeden-kosciol-szesc-domow-publicznych-i-dwa-obozy-jenieckie/. – Дата доступа: 25.09.2016.
5. Obowiązek nauki religji katolickiej w szkołach // Kurjer Wilenski. – 1927. – 11 stycznia. – S. 4.
6. Mały Rocznik Statystyczny Rok wydawnictwa 5 [Электронны рэсурс] / Mazowiecka Biblioteka Cyfrowa. – Рэжым доступа: http://mbc.cyfrowemazowsze.pl/dlibra/docmetadata?id=14468&from=publication. – Дата доступа: 25.09.2016.
7. Крывуць, В.І. Пад шыльдай "Дзяржаўнага выхавання": рэалізацыя ўрадавых выхаваўчых канцэпцый на тэрыторыі Беларусі (1926–1939) : манагр. / В.І. Крывуць. – Баранавічы : РВА БарДУ, 2010. – 195 с.
8. Вайцешчык, Г.С. Уплыў тэатра і кіно на культурнае развіццё мястэчак Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг. / Г.С. Вайцешчык // Веснік ГрДУ імя Янкі Купалы. Сер. №1. – 2011. – № 3. – С. 19–31;
9. Aresztowanie podpalacza // Kurjer Wilenski. – 1927. – 9 stycznia. – S. 8.